10



# Знакамітыя мінчане XIX–XX стст.

Мінск і Міншчына пасля падзей 1921 года – лёсы людзей і краіны

*Польскі Інстытут у Мінску*

*Прыватная ўстанова адукацыі «БІП-Інстытут правазнаўства»*

# ЗНАКАМІТЫЯ МІНЧАНЕ

## XIX–XX стст.

## Мінск і Міншчына

## пасля падзей 1921 года – лёсы людзей і краіны

----------------------

*Матэрыялы*
*X Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
*Мінск, 13-14 верасня 2016 г.*

*Мінск*
*Выдавец В. Хурсік*
*2017*

УДК 94(476-25)”1921”+94(438).074 (063)
ББК 63.3(4Беі)л.0
371

Рэдакцыйная калегія:
*Анатоль Вялікі, Здзіслаў Вінніцкі (навук. рэд.),*
*Раман Юркоўскі, Мацей Мруз, Анатоль Трафімчык*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар У. І. Навіцкі;
доктар гістарычных навук, прафесар У. В. Тугай

371 **Знакамітыя** мінчане: Мінск і Міншчына пасля падзей 1921 года – лёсы людзей і краіны: Матэрыялы X Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 13–14 верасня 2016 г./ Польскі Інстытут у Мінску, ПУА «БІП-Інстытут правазнаўства»; рэдкал.: А. Вялікі [і інш.]; навук. рэд. А. Вялікі і З. Вінніцкі. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2017.–280с.

ISBN 978-985-7025-79-4

У зборнік уключаны матэрыялы навуковых даследаванняў польскіх і беларускіх вучоных, у якіх адлюстраваны праблемы эканамічнага, сацыяльнага і культурна-асветнага развіцця Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Звяртаецца ўвага на лёсы людзей пасля падзей 1921 г., якія жылі, працавалі і тварылі ў гэты складаны перыяд нашай гісторыі. Узнімаюцца праблемы адукацыі і нацыянальных школ, а таксама палітыка беларусізацыі ў пазначаны адрэзак часу.

Адрасуецца вучоным, выкладчыкам, аспірантам і студэнтам гістарычных факультэтаў, шырокаму колу чытачоў, якія цікавяцца і вывучаюць беларуска-польскія, польска-беларускія ўзаемаадносіны.

**УДК94(476-25)”1921”+94(438).074 (063)**
**ББК 63.3(4Беі)л.0**

Zrealizowano przy wsparciu finansowym Instytutu Polskiego w Mińsku
Надрукавана пры фінансавай падтрымцы Польскага Інстытута ў Мінску

ISBN 978-985-7025-79-4

© Польскі Інстытут у Мінску, 2017

© Віктар Хурсік, афармленне, 2017

*Аляксандр Вабішчэвіч (Брэст)*

# САВЕЦКІ ФАКТАР У ГРАМАДСКІМ ЖЫЦЦІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў перыяд знаходжання заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы (1921–1939 гг.) з'яўляецца прадметам даследаванняў беларускіх вучоных. У беларускай савецкай гістарычнай навуцы падзеі таго часу не атрымалі ўсебаковага аналізу, што было звязана з пануючымі метадалагічнымі падыходамі, ідэалагічнымі забаронамі, абмежаваным доступам да крыніц (асабліва архіўных дакументаў). Уплыў СССР на заходнебеларускія землі ў 1920–30-я гг. паказваўся адназначна пампезна, без глыбокага вывучэння яго дэтэрмінуючых фактараў і наступстваў. Замоўчваліся многія «нязручныя» аспекты гэтай праблематыкі. Толькі ў 1990-я гг.— пачатку XXI ст. пачалося аб'ектыўнае даследаванне гэтай праблематыкі з выкарыстаннем комплекснай метадалогіі, на падставе новых крыніц. Праблематыка не траціць сваёй актуальнасці, бо і цяпер нярэдка ў грамадскай свядомасці не толькі палякаў, але і некаторых беларусаў захоўваюцца стэрэатыпы, што абсалютызуюць ролю савецкага фактару ў грамадскім жыцці Заходняй Беларусі, змяншаюць ці наогул падвяргаюць сумненню самастойнасць беларускага руху ў міжваеннай Польшчы. Гэта невыпадкова, бо такія ацэнкі прысутнічаюць у заходняй (пераважна польскай) гістарычнай навуцы, актыўна распаўсюджваюцца ў інтэрнэт-прасторы.

Адразу пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора кіраўніцтва БССР, якое яго не падпісвала, стала, аднак, праяўляць пільную цікавасць да захавання польскім бокам гарантаваных правоў і свабод сваіх суайчыннікаў. 28 ліпеня 1921 г. урад БССР звяртаўся з тэлеграмай на імя Наркама замежных спраў РСФСР Г. Чычэрына аб неабходнасці звярнуць увагу польскага ўрада на недапушчальнасць «здзекаў над насельніцтвам Заходняй Беларусі»[1]. Наркамат замежных спраў БССР накіраваў у жніўні 1921 г. ураду Польшчы ноту пратэсту супраць дыскрымінацыі беларускага насельніцтва, дзе ў даволі карэктнай форме было заяўлена аб недапушчальнасці парушэння абавязацельстваў па Рыжскім мірным дагаворы і выказвалася ўпэўненасць у стварэнні ў Польшчы спрыяльных умоў для грамадскага развіцця беларусаў[2]. Хоць дадзены самастойны дэмарш Мінска ў Маскве расцанілі занадта мяккім,

---

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 6. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 283.

[2] Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.: в 2 кн. Кн. 1. Минск, 2014. С. 411.

аднак у далейшым савецкі бок усяляк імкнуўся не абвастраць адносіны з Польшчай. У час свайго візіту ў Польшчу восенню 1922 г. Г. Чычэрын ніякіх прэтэнзій не прад'яўляў. 10 мая 1924 г. тым жа Г. Чычэрыным была падпісана нота пасланніку Польшчы ў СССР Л. Дароўскаму аб парушэннях польскім урадам правоў нацыянальных меншасцей: «Ва ўсіх сферах нацыянальнага жыцця ўкраінцаў і беларусаў, якія знаходзяцца ў межах Польскай Рэспублікі, польскія ўлады зусім адкрыта паказалі нежаданне выконваць абавязацельствы, узятыя Польшчай па Рыжскім міры»[3]. Рабілася спроба савецкага боку прыпыніць выкананне сваіх матэрыяльных абавязацельстваў па Рыжскім міры за парушэнне Польшчай правоў нацыянальных меншасцей, аднак яна не ўвянчалася поспехам, бо разглядалася ў якасці акта ўмяшання ў яе ўнутраныя справы. У цэлым, у першай палове 1920-х гг. савецкі ўрад не рабіў рэзкіх захадаў у адносінах да Польшчы, абмяжоўваўся толькі нотамі пратэсту супраць яе падтрымкі антысавецкіх фарміраванняў. Асобныя спробы савецкага боку аказаць уздзеянне на Польшчу ў справе выканання ўзятых абавязацельстваў па забеспячэнні свабоднага развіцця культуры і адукацыі беларусаў, ажыццяўлення імі рэлігійных культаў выклікалі адваротныя абвінавачванні і пагражалі дэстабілізацыяй двухбаковых адносін.

Адначасова з дыпламатычнымі захадамі ў першай палове 1920-х гг. савецкае кіраўніцтва скрытна аказвала падтрымку прасавецкай партызанскай барацьбе (у польскай гістарычнай навуцы яна кваліфікавана як антыдзяржаўная дыверсійная дзейнасць[4]) у Заходняй Беларусі, у якой удзельнічалі як закінутыя туды з БССР, так і мясцовыя жыхары. Чэкісцкія органы БССР аказвалі падтрымку партызанскім атрадам, якімі кіравалі камуністы, забяспечвалі ім бесперашкодны праход праз савецка-польскую мяжу. Толькі ў 1922 г. было здзейснена 878, у 1923 г.— 503 партызанскія напады. Атрад С. Ваўпшасава разам з падпольнымі групамі правёў больш за 100 баявых аперацый[5].

Частка фінансавых сродкаў, што паступала ў Заходнюю Беларусь з усходу, выкарыстоўвалася для падтрымкі беларускіх грамадскіх

---

[3] Знешняя палітыка Беларусі: зб. дакументаў і матэрыялаў. Т. 2 (1923–1927 гг.). Мінск, 1999. С. 104.

[4] Śleszyński W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. Warszawa, 2007. S. 293–311; Śleszyński W. Województwo Poleskie. Kraków, 2014. S. 236–253; Cichoracki P. Stołpce-Łowcza-Leśna 1924: II Rzeczpospolita wobec najpoważniejszych incydentów zbrojnych w województwach północno-wschodnich. Łomianki, 2012 і інш.

[5] Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.). Мінск, 2006. С. 390, 392; Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.: в 2 кн. Кн. 1. Минск, 2014. С. 395.

арганізацый, школ. У адным з лістоў, перахопленых у пачатку 1924 г. польскімі органамі бяспекі, старшыня СНК БССР А. Чарвякоў пісаў А. Луцкевічу ў Вільню: «Усё, што прасілі, пасылаем праз Бандарчука. Долары дашлём праз Соню. У прэсе давайце інфармацыю, што грошы атрымалі з Амерыкі»[6]. Заходнебеларускімі дзеячамі (Р. Астроўскім і інш.) падтрымліваліся цесныя кантакты з У. Ігнатоўскім і іншымі кіраўнікамі БССР[7].

Прасавецкай арыентацыі спрыяла і актыўная прапагандысцкая праца. Па сведчанні польскіх паліцэйскіх Валожынскага павета Віленскага ваяводства (1923 г.), усё мясцовае беларускае насельніцтва мела «рускую тэндэнцыю». «Цягне яго туды сіла золата і абяцанні «савецкага раю». У значнай меры ўплывае на гэта агітацыя, якая актыўна разгорнута прысланымі з Савецкай Расіі. ... Звычайна яны маюць сувязь з мясцовымі адзінкамі, якія аказваюць вялікі ўплыў на насельніцтва. ... Газеты і брашуры распаўсюджваюць цэлымі пачкамі»[8]. Нягледзячы на відавочнае перабольшанне маштабаў дапамогі з боку краіны Саветаў, польскія паліцэйскія выразна паказалі ўзмацненне прасавецкіх настрояў. Гэта адбывалася ва ўмовах абвастрэння нявырашаных нацыянальных і сацыяльных праблем у заходнебеларускім грамадстве, асабліва ў прыгранічных рэгіёнах. Пэўныя сімпатыі і русафільскія настроі мелі і рэпатрыянты-бежанцы, што вярталіся з усходу — да сярэдзіны 1924 г. іх прыехала ў родныя мясціны да 500 тыс. чалавек. Пасля вяртання нярэдка «яны аўтаматычна рабіліся людзьмі другой катэгорыі, з абмежаванымі грамадзянскімі правамі»[9].

На фоне нерэалізаванасці спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове савецкая арыентацыя з сярэдзіны 1920-х гг. стала дамінуючай. На гэта дабратворна ўплывала існаванне на ўсходзе беларускай савецкай рэспублікі, яе поспехі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Вельмі прывабным тады быў вобраз БССР, «агульнабеларускага дома». Нават непрыхільны да камуністаў лідар беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў А. Станкевіч прызнаваў значныя поспехі ў Савецкай Беларусі ў галіне культуры і адукацыі. «Факт застаецца фактам, што жыццё беларускага народа там зрушылася з месца, што беларускіх школ налічваюцца тысячы»[10].

---

[6] Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas. F. 51. Ap. 17. B. 5. L. 93.

[7] Пашкевіч А. Справа «Беларускага нацыянальнага цэнтру» паводле сведчанняў былых актывістаў Кампартыі Заходняй Беларусі» // Спадчына. 2006. № 1. С. 105.

[8] Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 23.

[9] Фіонік Д. Беженство: дорога і повороты: 1915–1922. Bielsk Podlaski, 2015. С. 206.

[10] Беларуская крыніца. 1926. 21 кастр.

Іншыя знешнія фактары, акрамя савецкага, да сярэдзіны 1920-х гг. ужо перасталі быць вызначальнымі. Заходнееўрапейская дэмакратыя сваёй абыякавасцю да беларускага пытання толькі ўзмацніла настроі расчаравання. Утвараная ў 1923 г. Кампартыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), ідэалам якой было самавызначэнне Заходняй Беларусі і яе ўз'яднанне з БССР, выступала за сацыялістычныя і агульнадэмакратычныя патрабаванні. Менавіта КПЗБ і асабліва створаная ў 1925 г. Беларуская работніцка-сялянская Грамада (Грамада) прапаноўвалі альтэрнатыўны план вырашэння беларускага пытання. Паводле ацэнкі польскіх улад, палітыка Камінтэрна адносна Польшчы была скіравана выклікаць ва ўсходніх ваяводствах паўстанне на нацыянальнай і сацыяльнай глебе пад лозунгам адарвання ад Польшчы і ўз'ядання з суседнімі Савецкай Беларуссю і Савецкай Украінай. КПЗБ разглядалася як экспазітура Камінтэрна, асноўным напрамкам дзейнасці якой было «паглыбленне сярод няпольскага насельніцтва існуючых сацыяльных адрозненняў, аб'яднанне іх з нацыянальнымі праблемамі і адпаведнае выкарыстанне як адных, так і другіх для пастаяннага падтрымання грамадскай думкі шырокіх слаёў мясцовага насельніцтва ў стане няспыннага кіпення і хвалявання, каб у пэўны час выкарыстаць гэты момант»[11]. Польскія ўлады разглядалі Грамаду толькі як вынік савецкага фактару і дзяржаўнай здрады беларусаў у складзе Польшчы[12]. Паміж Камінтэрнам, КПЗБ і Грамадой ставіўся знак роўнасці. Польскія органы бяспекі адмоўна ацэньвалі дзейнасць і Беларускага пасольскага клуба «Змаганне» (1928–1930 гг.): «толькі як агентура замежнай дзяржавы», а паслоў — не інакш, як «платных агентаў»[13].

Нявырашанасць аграрнага пытання, нацыянальны прыгнёт стваралі спрыяльныя ўмовы для ўзмацнення прасавецкіх (камуністычных) настрояў. Сацыяльная, эканамічная і палітычная сітуацыя неаднаразова спрыяла камуністам[14]. Акрамя таго, на гэта ўплывала культурная блізкасць з рускім народам, пачуццё часовасці польскай адміністрацыі, аб чым даводзіла камуністычная прапаганда, патрэба радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, прывабнасць беларускай савецкай дзяржаўнасці (у форме БССР)[15]. Створаная польская адміністрацыя была чужой структурай для мясцовага насельніцтва, што не спрыяла пабудове

---

[11] B.W.P.K.P. jako agentura Kominternu. Warszawa, 1930. S. 5.

[12] Мірановіч Я. Барацьба санацыйных уладаў са спадчынай Грамады // Гістарычны альманах. Т. 12. Гародня-Беласток, 2006. С. 52.

[13] B.W.P.K.P. jako agentura Kominternu. Warszawa, 1930. S. 109.

[14] Cichoracki P. Komuniści na Polesiu w latach 1921–1939: z dziejów politycznych. Łomianki, 2016. S. 249.

[15] Сьляшынскі В. Барацьба дзяржаўных органаў зь беларускай дывэрсійнай дзейнасьцю на паўночна-ўсходніх землях міжваеннай Польшчы (1920–1925) // Arche = Пачатак. 2007. № 1–2. С. 123.

нацыянальнай ці дзяржаўнай супольнасці. Таму адхіленая ад грамадска-палітычных працэсаў значная частка няпольскага насельніцтва нявольна сутыкалася з антыдзяржаўнай дзейнасцю (звязвалася найперш з камуністамі)[16]. «Арыентацыя на ўсход (на Мінск) і цяга насельніцтва да Савецкай Расіі — гэта той вынік, якога дасягнула крэсавая адміністрацыя»,— заяўляў у адной са справаздач канфідэнт 2-га аддзела польскага Генштаба Р. Зямкевіч. Яшчэ раней ён папярэджваў аб небяспечным характары лёгкадумнасці пры ажыццяўленні гвалтоўнай палітыкі польскімі ўладамі. «Беларускі рух выразна кіруецца пад бальшавіцка-камуністычным сцягам. Яго накіравала ў гэты бок палітыка альбо адсутнасць палітыкі польскіх кіруючых колаў. Пазбаўленыя ўсялякіх культурных правоў з-за закрыцця школ і кааператываў, беларускія інтэлігенты замест разбітай і немагчымай культурніцкай працы ўсе без выключэння кінуліся да палітычнай працы»[17]. Паводле Л. Васілеўскага, супрацьстаяць усходняму (савецкаму) ўплыву Польская дзяржава магла шляхам стварэння больш спрыяльных умоў для беларусаў у параўнанні з іх суайчыннікамі, якія пражывалі ў краіне Саветаў, асабліва ў сацыяльна-эканамічнай сферы, адукацыі[18]. Ён папярэджваў польскую адміністрацыю аб тым, што савецкія ўлады імкнуцца стварыць у БССР «беларускі П'емонт», які будзе прыцягальным для заходнебеларускага насельніцтва[19]. Прадстаўнік лагера пілсудчыкаў Э. Экерт лічыў, што Польская дзяржава сама падштурхоўвала жыхароў «усходніх крэсаў» да канспірацыйнай антыпольскай працы тым, што «закрывае перад імі ўсе афіцыйныя ўстановы, ускладняе легальную культурную працу, абмяжоўвае поле іх нармальнай грамадскай дзейнасці»[20]. Аднак кіруючыя колы Польшчы адмаўляліся прымаць такія рэкамендацыі. Гэта і прывяло да страты імі ініцыятывы ў беларускім пытанні ў параўнанні з БССР. Умовы грамадскага жыцця беларусаў па абодва бакі польска-савецкай мяжы ніяк не сведчылі на карысць Польшчы[21].

З усталяваннем рэжыму «санацыі» Ю. Пілсудскага пасля майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту яго ідэолагі спадзяваліся на расчараванне беларусаў у савецкай нацыянальнай палітыцы і на іх наступны кампраміс

---

[16] Śleszyński W. Województwo Poleskie. Kraków, 2014. S. 309.

[17] Чарнякевіч А., Пашкевіч А. Псіхалогія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзела польскага Генеральнага штаба // Arche = Пачатак. 2005. № 6. С. 231.

[18] Wasilewski L. Zadania polskiej polityki narodowościowej // Droga. 1923. № 4. S. 26.

[19] Wasilewski L. Białoruś i ruch białoruski // Przegląd współczesny. 1924. № 9. S. 395.

[20] Цыт. па: Сьляшынскі В. Барацьба дзяржаўных органаў зь беларускай дывэрсійнай дзейнасьцю… С. 128.

[21] Kurkiewicz M. Sprawy białoruskie w polityce rządu Władysława Grabskiego.— Warszawa, 2005. S. 32.

з Польшчай, які ўяўляўся ў якасці «меншага зла». Як паказаў далейшы ход падзей, новая тактыка польскіх улад, накіраваная на лавіраванне з беларусамі, не дала чаканага выніку.

У сярэдзіне 1920-х гг. з Савецкай Беларусі для заходнебеларускіх партый і грамадскіх арганізацый аказвалася арганізацыйная, прапагандысцкая, вучэбна-метадычная, фінансавая дапамога. Пры садзейнічанні Камінтэрна з ліпеня 1924 г. да лютага 1925 г. у Мінску пры ЦК КП(б)Б дзейнічала Бюро дапамогі КПЗБ («замежнае бюро», «закардоннае бюро»). Рашэнне аб яго стварэнні для «аказання садзейнічання КПП і КПЗБ у яе рэвалюцыйнай працы» было прынята на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 17 ліпеня 1924 г.[22]. У той жа дзень адбылося яго першае пасяджэнне, дзе сярод іншага пастанавілі браніраваць па лініі Наркамасветы БССР да 50 месцаў у ВНУ рэспублікі для заходнебеларускай моладзі[23]. Такія льготныя ўмовы для заходнебеларускай моладзі былі да канца 1920-х гг. Дзякуючы гэтаму, частка заходнебеларускай моладзі (найперш навучэнцаў і выпускнікоў Віленскай, Навагрудскай гімназій, якія не мелі шанцаў атрымаць вышэйшую адукацыю ў Польшчы) нелегальна перабіралася праз польска-савецкую мяжу і паступала на вучобу ў БССР. Пасля заканчэння навучальных устаноў маладыя людзі з энтузіязмам уключаліся ў грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё Савецкай Беларусі. Нароўні з мэтанакіраванай падтрымкай КПЗБ, «замежнае бюро» аказвала дапамогу беларускай гімназіі ў Вільні, выступала за адкрыццё беларускіх пачатковых школ, аднак прызнала немэтазгодным стварэнне асобнага Таварыства культурнай дапамогі Заходняй Беларусі, бо гэта быццам пашкодзіць працы самога «замежнага бюро»[24]. Адмова ад стварэння легальнай структуры, якая б спрыяла ўзаемаадносінам у галіне культуры, была вынікам фактычна двайнога кіраўніцтва заходнебеларускім рухам з боку Камінтэрна і КП(б)Б[25]. Замест «замежнага бюро» у сакавіку 1925 г. было створана Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б), якое фактычна з'яўлялася мінскім філіялам Прадстаўніцтва Кампартыі Польшчы пры Выканкаме Камінтэрна ў Маскве і праіснавала да лета 1937 г.

Са стварэннем Грамады ўзніклі некаторыя магчымасці для фінансавай дапамогі нешматлікім беларускім гімназіям, Таварыству беларускіх школ (ТБШ). Аднак такая падтрымка мела пэўную ідэалагічную накіраванасць.

---

[22] НАРБ. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 3. Арк. 227.

[23] Там жа. Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 58. Арк. 1; Спр. 33. Арк. 2.

[24] Там жа. Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 33. Арк. 6, 10–11.

[25] Цынкевіч В. М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай рэспублікай у 1921–1929 гг.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. Мінск, 2004. С. 15.

У тэзісах ЦК КП(б)Б «Беларускі рух за кардонам» ад 16 кастрычніка 1925 г. былі вызначаны меры для ўзмацнення савецкага ўплыву ў асяроддзі беларускай эміграцыі, сярод якой прадугледжвалася «працягваць працу па разлажэнні і драбленні», па прадухіленні стварэння там аб'яднанняў нацыянальнай арыентацыі, што магло б «затармазіць стварэнне беларускага руху савецкай арыентацыі»[26]. Выдзеленыя для заходнебеларускіх арганізацый на 1926/1927 г. 132 тыс. рублёў былі прызначаны на ўтрыманне легальных структур Грамады, яе друкаваных выданняў, дапамогу беларускім культурна-асветніцкім арганізацыям, беларускім гімназіям, «дзе нам ўяўляецца магчымым весці працу». Амаль чвэрць усяго гадавога бюджэту была адведзена на патрэбы грамадскіх арганізацый[27]. 30 сакавіка 1927 г. Палітбюро ЦК УКП(б) дазволіла ЦК КП(б)Б дадаткова расходаваць да канца бюджэтнага году на «закордонную працу» праз сакратарыят Камінтэрна 48 тыс. долараў, з якіх значная частка прызначалася для Заходняй Беларусі[28].

Фінансаванне заходнебеларускіх арганізацый ажыццяўлялася праз савецкае пасольства ў Варшаве і пры асабістым садзейнічанні адказнага работніка пасольства А. Ульянава, пры дапамозе створанага ў Вільні Беларускага кааператыўнага банка[29]. Арганізацыйнымі пытаннямі атрымання дапамогі займаліся Р. Астроўскі, С. Рак-Міхайлоўскі і іншыя заходнебеларускія дзеячы[30]. ЦК КП(б)Б імкнуўся не дапусціць стварэння якога-небудзь ўсебеларускага цэнтра ў Польшчы ці ў іншай краіне. «Прызнаючы працу т.[*таварыша*] Ульянава вельмі паспяховай, даць яму магчымасць без асаблівых абмежаванняў праводзіць яе і надалей»[31]. Рэкамендавалася змяніць формы працы, актывізаваць масавыя акцыі (забастоўкі, школьныя кампаніі і г. д.).

У Заходняй Беларусі былі зацікаўлены ў атрыманні з БССР не толькі прапагандысцкай літаратуры, але і навуковай, вучэбна-метадычнай, мастацкай літаратуры. У кніжнай краме Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні разам з заходнебеларускімі вучэбнымі выданнямі можна было набыць і кнігі выдавецтваў Савецкай Беларусі.

---

[26] Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918–1945: сб. документов: в 2 ч. Ч. 1. Минск, 1990. С. 195, 197.

[27] НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 112. Арк. 5, 5адв., 9.

[28] Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск, 2000. С. 190.

[29] Илькевич Н.Н., Платонов Р.П. Александр Ульянов и версия НКВД об антисоветском подполье в БССР (Фальсификация органами НКВД уголовных дел в 1937–1938 гг.). Минск, 1997. С. 25.

[30] Валахановіч А. І., Міхнюк У.М. Споведзь у надзеі застацца жывым: аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча. Мінск, 1999. С. 74, 44–46.

[31] НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 112. Арк. 87.

Нягледзячы на савецкі ўплыў, Грамада ўсё-такі не была вынікам знешняга ўмяшальніцтва. Яна з'яўлялася рэальнай самастойнай палітычнай сілай, стала масавай нацыянальна-дэмакратычнай арганізацыяй (па розных ацэнках налічвала 100–120 тыс. чалавек). Гэта і паслужыла галоўнай прычынай яе разгрому польскімі ўладамі ў пачатку 1927 г. Пасля ліквідацыі Грамады заходнебеларускі рух не змог ужо дасягнуць такога размаху. Аб эвалюцыі сваіх поглядаў ад паланафільскіх да саветафільскіх гаварыў на судовым працэсе па справе Грамады яе лідар Б. Тарашкевіч. «Не скажу, што БССР — мой ідэал, таму што веру ў будучы саюз народаў, у якім беларусы стануць свабодным народам»[32]. Ён не ўтойваў, што савецкая арыентацыя спачатку не была асноўнай у дзейнасці арганізацыі. На судовым працэсе Грамады ў лютым-маі 1928 г. падкрэслівалася, што ў яе выданнях (газетах «Жыццё беларуса», «Беларуская ніва», «Беларуская справа», «Наша воля», «Народны звон» і інш.) «заўсёды была выяўлена сімпатыя да Савецкай Расіі»[33].

Савецкай прапагандай сапраўды ствараўся прывабны воблік жыцця ў краіне Саветаў. Невыпадкова, што частка жыхароў Заходняй Беларусі гэтаму паверыла і нелегальна падалася туды на вучобу, працу. Так, аб сістэматычных нелегальных уцёках сялян-беднякоў праз мяжу на ўсход паведамлялася ў справаздачы камендатуры паліцыі Валожынскага павета за красавік 1926 г. У пратаколах допытаў затрыманых пры нелегальным пераходзе польска-савецкай мяжы амаль усе яны сцвярджалі, што «вымушаны былі падацца ў Расію (Савецкі Саюз, куды ўваходзіла БССР — *А. В.*), каб знайсці кавалак хлеба, бо паводле чутак умовы жыцця сялянства ў Расіі значна лепшыя». «Былі выпадкі, калі селянін прадаваў апошняга каня ці карову, адзіны сродак існавання, і разам з жонкай і дзецьмі адпраўляўся ў дарогу, пераходзіў мяжу пры дапамозе праваднікоў, плаціў ім усё, што меў, пры вяртанні назад — траціў усялякія сродкі для далейшага існавання»[34].

Пасля разгрому Грамады, узмацнення левасектанцкай тэндэнцыі ў КПЗБ, адмовы Камінтэрна ад супрацоўніцтва з некамуністычнымі палітычнымі сіламі з канца 1920-х гг. рэзка скарацілася матэрыяльная дапамога з СССР. Не было шанцаў яе атрымаць нешматлікай заходнебеларускай інтэлігенцыі, якая мела ідэалагічныя рознагалоссі з камуністамі.

Акрамя матэрыяльнай дапамогі, з Савецкай краіны для заходнебеларускага руху таксама аказвалася і маральная падтрымка, хоць

---

[32] Bergman A. Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu. Warszawa, 1977. S. 162.
[33] Заходняя Беларусь на лаве падсудных. Працэс Беларускай сялянска-работніцкай Грамады. 23 лютага — 22 мая 1928 г. Мінск, 1929. С. 206.
[34] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 662. Воп. 3. Спр. 23. Арк. 157.

яна і рэгламентавалася дырэктыўнымі ідэалагічнымі мерамі вышэйшых партыйных органаў. Напрыклад, у адказ на рэпрэсіі польскіх улад супраць Грамады быў распрацаваны цэлы комплекс адпаведных практычных мер па разгортванні хвалі пратэсту грамадскасці Савецкай Беларусі. Палітбюро ЦК УКП(б) 20 студзеня 1927 г. абавязала ЦК КП(б)Б разгарнуць кампанію барацьбы з «фашыстоўскім тэрорам у Польшчы». Рэкамендавалася праводзіць кампанію так, каб прадставіць прыняцце рэзалюцый у якасці народнага волевыяўлення, а не акцыі, кіруемай зверху. 27 студзеня 1927 г. у Мінску група дзеячаў беларускай культуры і навукі з 28 чалавек, сярод якіх былі Я. Купала, Я. Колас і інш., прыняла зварот да дзеячаў навукі Захаду, у якім інфармавала пра рэпрэсіі польскага ўрада ў адносінах да беларусаў[35]. Спецыяльны камітэт навуковых работнікаў і пісьменнікаў па абароне Грамады быў створаны ў Мінску 26 лютага 1928 г. На пасяджэнні яго прэзідыума 1 сакавіка 1928 г. было вырашана падрыхтаваць і выдаць асобную брашуру са зваротам і пратэстам камітэта да польскага ўрада; звярнуцца да навуковых работнікаў Масквы, Ленінграда, Харкава, Кіева і Адэсы адносна арганізацыі там кампаніі пратэсту, арганізацыі серыі выступленняў членаў камітэта ў мясцовай прэсе і па радыё.

Прынятыя рашэнні былі ў цэлым адобраны 2 сакавіка 1928 г. на закрытым пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б. У той жа дзень у рэспубліканскіх газетах «Савецкая Беларусь», «Звязда» быў апублікаваны зварот камітэта на чале з Я. Купалам «Да дзеячаў навукі і культуры, працоўных усяго свету»[36]. Палітбюро ЦК УКП(б) 15 сакавіка 1928 г. дало санкцыю на стварэнне гэтага камітэта[37]. Каб сабраць сродкі для дапамогі арыштаваным лідарам Грамады, у Мінску праводзіліся разнастайныя грамадска-культурныя мерапрыемствы.

Нягледзячы на тое, што савецкі ўплыў быў адчувальным на тэрыторыі Заходняй Беларусі да канца 1920-х гг., нельга празмерна перабольшваць яго маштабы і значнасць, абсалютызаваць «руку Масквы». Польскім уладам было вельмі выгадна дэманстраваць (асабліва на еўрапейскім узроўні) заходнебеларускі рух праз прызму камуністычнай пагрозы, інспіраваным звонку, пазбаўленым самастойнасці. Прыкрываючыся абвінавачваннямі аб залежнасці ад Масквы і Камінтэрна, польскія ўлады мелі заўсёды козыры ва ўжыванні рэпрэсіўных дзеянняў не толькі супраць камуністаў, але і іншых заходнебеларускіх партый і аб’яднанняў, акрамя нешматлікіх паланафільскіх.

Праводзячы ўзмоцнена антысавецкую прапаганду, польская адміністрацыя недаацэньвала сацыяльна-псіхалагічныя моманты.

---

[35] Звязда. 1927. 27 студз.

[36] Купала Я. Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 9, кн. 2. Мінск, 2003. С. 378–380, 14–16.

[37] Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. С. 191.

Праграмныя палажэнні камуністаў і ідэйна блізкай да іх Грамады імпанавалі заходнебеларускаму сялянству не столькі сваім ідэалагічным зместам і рэвалюцыйным пафасам, колькі радыкальнай антыпольскай пазіцыяй, з імі звязваліся пэўныя надзеі на магчымае паляпшэнне сацыяльнага становішча і пазбаўленне ад нацыянальнага прыгнёту[38]. Пра тое, што шмат у чым распаўсюджванню камуністычных ідэй у заходнебеларускім грамадстве спрыяла жорсткая нацыянальная і сацыяльная палітыка польскіх улад, адзначалі тады і некаторыя польскія вучоныя[39]. На працягу 1930–1939 гг. у Вільні дзейнічала саветалагічная ўстанова — Навукова-даследчы інстытут Усходняй Еўропы, які размяшчаўся ў памяшканні бібліятэкі Урублеўскіх. У 1932 г. пры Інстытуце была заснавана Вышэйшая школа палітычных навук, дзе выкладалі пераважна прафесары Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя[40]. Большасць спецкурсаў для слухачоў была прысвечана праблематыцы Савецкага Саюза. Беларуская тэматыка была прадстаўлена асобным лекцыйным курсам С. Віславуха.

У грамадскай свядомасці часткі заходніх беларусаў камуністычныя (левыя, радыкальныя) погляды атаясамліваліся з савецкай арыентацыяй. На фарміраванне гэтых стэрэатыпаў паўплывала савецкая прапаганда. Немалую ролю ў стварэнні негатыўнага вобраза Польшчы, палякаў ігралі і гістарычныя традыцыі ментальнасці. У свядомасці многіх беларусаў сацыяльныя стэрэатыпы перапляліся з этнічнымі — палякі па-ранейшаму заставаліся «ляхамі», «панамі» і г. д. Большасць беларусаў адчувалі сябе ў складзе Польскай дзяржавы «чужым элементам». Спробы беларуска-польскага збліжэння ў першай палове 1920-х гг. не ўвянчаліся поспехам. Паланафільскія ідэі не знайшлі грамадскага прызнання беларусаў, а іх прыхільнікі не мелі якога-небудзь значнага ўплыву. У асяроддзі заходнебеларускай палітычнай эліты (акрамя яе нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычнага крыла) усё больш схіляліся да пераканання, што рашэнне беларускага пытання немагчыма без дапамогі звонку, г. зн. з Савецкай Беларусі і СССР наогул. Нярэдка негатыўную інфармацыю ў польскай прэсе пра становішча ў краіне Саветаў многія заходнія беларусы ўспрымалі ў якасці варожай, антысавецкай.

---

[38] Токць С. М. Беларуская вёска на мяжы эпох: змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду аграрнага грамадства (па матэрыялах Гарадзеншчыны 19 — першай трэці 20 ст.). Гродна, 2003. С. 125.

[39] Wysłouch S. Rola Komunistycznej Partii Zachodniej Białorusi w ruchu narodowym Białorusinów w Polsce. Wilno, 1933.

[40] Kornat M. Polska szkoła sowietologiczna (1930–1939). Kraków, 2003. S. 524–541; Zackiewicz G. Polska myśl polityczna wobec systemu radzieckiego (1918–1939). Kraków, 2004. S. 618–629.

На ўзроўні міждзяржаўных савецка-польскіх адносін з сярэдзіны 1920-х гг. заходнебеларуская праблематыка не закраналася. Савецкае кіраўніцтва дэкларавала непарушнасць Рыжскага мірнага дагавора, таму не збіралася выразна падтрымліваць заходнебеларускі рух[41]. Акрамя таго, у яго не было жадання ўскладняць працэс перамоў аб магчымым заключэнні двухбаковага дагавора аб ненападзе, праект якога быў падрыхтаваны ў канцы лета 1926 г. Аднак прыярытэт германскага напрамку ў савецкай дыпламатыі адклаў яго падпісанне. Такі дагавор быў заключаны толькі 25 ліпеня 1932 г. У якасці меры, якая спрыяла яго паспяховаму падпісанню, было зняцце ў чэрвені 1931 г. на V пленуме ЦК КПЗБ лозунга абавязковага далучэння Заходняй Беларусі да БССР. Такім чынам, дзяржаўныя структуры Савецкай Беларусі павінны былі адмовіцца ад яго публічнага дэкларавання.

Хоць ва ўмовах умацавання сталінскага таталітарнага рэжыму магчымасці для БССР па абароне заходніх беларусаў з канца 1920-х гг. былі істотна абмежаваны, аднак грамадскія структуры па-ранейшаму публічна адстойвалі іх інтарэсы. Іх дзеянні набывалі характар палітычных акцый. Напрыклад, творчая і навуковая інтэлігенцыя рэспублікі была ўключана ў прапагандысцкую кампанію, накіраваную супраць рэпрэсіўных дзеянняў польскіх улад і ў падтрымку левага крыла заходнебеларускага руху. 16 верасня 1932 г. Я. Купала разам з іншымі пісьменнікамі на вечары ў кінатэатры «Культура» ў Мінску вітаў заходнебеларускіх дзеячаў, якіх напярэдадні па абмене польскія ўлады выпусцілі з турмаў. Неаднаразова беларускія савецкія пісьменнікі, навуковыя работнікі, прадстаўнікі мастацкай інтэлігенцыі выступалі з публічнымі пратэстамі.

Па меры разгортвання з канца 1920-х гг. у БССР барацьбы з «нацыянал-дэмакратызмам» ранейшае добразычлівае стаўленне да выхадцаў з Заходняй Беларусі, якія апынуліся ў рэспубліцы, змянялася на падазронасць і недавер да іх. Пад уздзеяннем савецкай прапаганды адносна іх у грамадскай свядомасці пачалі складвацца адмоўныя стэрэатыпы. На гэта паўплывалі і рэпрэсіі ў Савецкай Беларусі ў 1930-я гг. У 1933 г. група дзеячаў заходнебеларускага руху (сярод іх былі былыя дэпутаты (паслы) польскага сейма Я. Гаўрылік, І. Дварчанін, С. Рак-Міхайлоўскі і інш.) былі прыцягнуты да сфабрыкаванай АДПУ справы «Беларускага нацыянальнага цэнтра», які нібыта рыхтаваў антысавецкае паўстанне для адарвання Савецкай Беларусі ад СССР. «Гэта паўстанне павінна было з'явіцца зачэпкай для пачатку фактычнай вайны паміж Польшчай і СССР, адарвання БССР, Полаччыны, Смаленшчыны і Чарнігаўшчыны ад Савецкага Саюза.

---

41 Сабалеўскі Ю. Беларуская сялянска-работніцкая грамада // Запісы Беларускага інстытута навукі і мастацтва. № 34. Нью-Ёрк; Мінск, 2011. С. 378, 384.

Аператыўны план паўстання быў распрацаваны польскім генеральным штабам, у прыватнасці генералам Рыдз-Сміглы»[42]. Ад былога сакратара Грамады М. Бурсевіча выбілі паказанні аб яго дачыненні да супрацоўніцтва з польскай дэфензівай. У прыватнасці, ён прызнаваўся ў неаднаразовых сустрэчах з «тайным канфідэнтам польскай дэфензівы», святаром беларускай праваслаўнай царквы ў Вільні А. Каўшом, аб прыналежнасці да агентуры дэфензівы М. Марцінчыка, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Мятлы, Р. Астроўскага, А. Луцкевіча і інш. У склад выдуманай падпольнай антысавецкай арганізацыі ў Вільні, якая быццам праводзіла разам з II Аддзелам польскага Генштаба контррэвалюцыйную дзейнасць на тэрыторыі БССР, уключалі Р. Астроўскага, А. Луцкевіча, А. Каўша, І. Мятлу, Ф. Стацкевіча, В. Рагулю, Ф. Ярэміча, В. Багдановіча, А. Уласава і іншых дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі Заходняй Беларусі[43].

Рэпрэсіўныя акцыі ў БССР супраць заходнебеларускага руху былі выгаднымі для польскіх органаў дзяржаўнай бяспекі. Як не пагадзіцца з роспачнымі і збянтэжанымі словамі Я. Гаўрыліка, былога пасла клуба «Змаганне», выказанымі ў мінскай турме ў адрас АДПУ: «Што вы робіце? … Вы выконваеце заданне польскай дэфензівы! Тыя не змаглі нас знішчыць, ды вы даканчваеце»[44].

Супрацоўнікі акадэмічнай камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, якая дзейнічала ў Мінску з 1926 г., былі абвінавачаны ў тым, што «займаліся па сутнасці контррэвалюцыйнай дзейнасцю, папулярызацыяй нацыяналістычных ідэй»[45]. Усе дзеянні па падтрымцы Заходняй Беларусі, прынятыя ў БССР у 1920-я гг., былі ацэнены ў якасці контррэвалюцыйнай і падрыўной антысавецкай працы. «Пад выглядам перакідвання культурных сіл для ўзмацнення беларусізацыі ў БССР Рак-Міхайлоўскі, Астроўскі і іх група цэлымі пачкамі перакідалі сваіх людзей. ... Гэта рабілася з мэтай насычэння савецкіх школ і ўстаноў нацдэмаўскімі элементамі, прасякнута нацыяналізмам і перакананнем аб перараджэнні савецкай улады для стварэння контррэвалюцыйных нацдэмаўскіх арганізацый»[46]. У актыўнай дапамозе ў перакідванні паслоў Грамады з Польшчы ў БССР «для актывізацыі і ўзмацнення нацфашысцкай працы» абвінавачвалі і Я. Купалу[47].

У ходзе чарговай хвалі сталінскіх рэпрэсій 1937–1938 гг. пацярпелі многія іншыя дзеячы, у тым ліку лідар Грамады Б. Тарашкевіч. Усіх іх беспадстаўна

---

[42] НАРБ. Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 456. Арк. 40.
[43] Там жа. Воп. 1а. Спр. 456а. Арк. 11–13.
[44] Пашкевіч А. Справа «Беларускага нацыянальнага цэнтру» паводле сведчанняў былых актывістаў Кампартыі Заходняй Беларусі” … С. 108.
[45] НАРБ. Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 580. Арк. 10.
[46] Там жа. Спр. 456. Арк. 133.
[47] Платонаў Р. П. Лёсы. Мінск, 1998. С. 222.

абвінавачвалі ў супрацоўніцтве з польскай палітычнай паліцыяй (дэфензівай), прымушалі дэклараваць «контррэвалюцыйны, нацдэмаўскі» характар сваёй дзейнасці. Былы савецкі дыпламат А. Ульянаў «прызнаўся» у тым, што па ўказанні рэжыму «санацыі» Ю. Пілсудскага нібыта ў БССР перакідваліся антысавецкія, контррэвалюцыйныя сілы; «закардоннае бюро» КПЗБ было пераўтворана ў «інструмент Пілсудскага для шырокіх палітычных правакацый, для падаўлення і разгрому рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі»; Віленская беларуская гімназія рыхтавала «для перакідання ў Беларусь шпіёнаў, дыверсантаў і тэрарыстаў» і г. д.[48].

У беларускім друку па-за межамі БССР змяшчалася як дакладная інфармацыя, так і розныя чуткі аб рэпрэсіўных акцыях. «Паводле паведамленняў з Мінска, ДПУ праведзены шматлікія арышты беларускіх дзеячаў у Полацку, Магілёве, Бабруйску і сярод арыштаваных шмат пісьменнікаў і журналістаў,— выкладзена ў адной з газет у Літве ў лютым 1931 г. — Дадаткова паведамляецца, што праф. Ігнатоўскі скончыў жыццё самагубствам не выстралам, а павесіўся на рамяні ў турэмнай камеры. Янка Купала меў намер скончыць самагубствам, зрабіў брытвай рану на горле. Яго ўсё ж удалося выратаваць»[49].

Трывожныя звесткі пра рэпрэсіі ў БССР супраць былых лідараў заходнебеларускага руху дэзарыентавалі частку жыхароў Заходняй Беларусі. Гэта адбывалася пры дапамозе савецкага друку, радыё, агітацыйнай дзейнасці актывістаў КПЗБ. На сходах людзі не верылі, што былыя беларускія паслы Грамады былі здраднікамі. «На вельмі многіх сходах многія таварышы выказваліся ў такім духу: «Каму ж такі цяпер можна верыць? Бо гэтыя паслы сядзелі ў турме, іх збівалі, а яны, аказваецца, здраднікі»[50]. Акрамя таго, узмацнялася ідэйна-палітычная канфрантацыя ў Заходняй Беларусі. Толькі пад уплывам рашэнняў VII кангрэса Камінтэрна ў 1935–1936 гг. назіраліся спробы наладжвання супрацоўніцтва заходнебеларускіх камуністаў і беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў у сумеснай акцыі аб падтрымцы беларускіх школ, аднак яны былі спынены польскай паліцыяй.

Пэўныя змены адбываліся і ў ментальнасці жыхароў БССР. У іх грамадскай свядомасці фарміраваліся адмоўныя стэрэатыпы «заходнікаў» (не толькі дзеячаў нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычнай арыентацыі, але і былых членаў Грамады, камуністаў і іх прыхільнікаў). Гэтаму

---

[48] Илькевич Н. Н., Платонов Р. П. Александр Ульянов и версия НКВД об антисоветском подполье в БССР…— С. 17, 19, 25.

[49] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 241. Арк. 206.

[50] НАРБ. Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 456. Арк. 29.

спрыяла і пагаршэнне савецка-польскіх адносін у другой палове 1930-х гг. Савецкая грамадскасць ўспрымала Польшчу ў якасці дзяржавы, ад якой зыходзіла патэнцыяльная пагроза нападу. Сітуацыя ўскладнілася рэпрэсіямі ў 1937 г. супраць кіраўнікоў Кампартыі Польшчы і КПЗБ, якія знаходзіліся ў СССР. У жніўні 1938 г. на падставе неабгрунтаванага абвінавачвання Выканкам Камінтэрна прыняў рашэнне аб роспуску КПП і яе састаўных частак (КПЗБ і КПЗУ) з фармулёўкай: «Камуністычную партыю Польшчы распусціць па прычыне яе засмечанасці шпіёнамі і правакатарамі»[51]. Гэта прывяло да канчатковай ліквідацыі ўцалелых да гэтага часу нешматлікіх арганізацыйных структур заходнебеларускага руху.

Аднак нават у такіх складаных умовах у штодзённай свядомасці заходніх беларусаў савецкі фактар заставаўся прыцягальным, значная частка з іх звяртала свае погляды на ўсход. Дамінаванне савецкага фактару пры верагодных геапалітычных зменах ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне рэальна ацэньвалі і прызнавалі нават некаторыя ідэалагічныя праціўнікі камуністаў з ліку заходнебеларускіх лідараў, сярод якіх быў А. Станкевіч. У сваім дзённіку з нагоды ўступлення савецкіх войскаў 17 верасня 1939 г. у Заходнюю Беларусь ён адзначаў: «У гэтым перш за ўсё добра тое, што ўся Беларусь у адным месцы — пад Саветамі. Так Польшча завяршыла сваё панаванне над беларусамі. Нічога дзіўнага — зрабіла ўсё, каб беларусаў ад сябе адштурхнуць»[52].

Шмат у чым гэтаму спрыяла і савецкая прапаганда, з якой ўсяляк змагаліся польскія ўлады. Для прадухілення нелегальнага праслухоўвання заходнебеларускімі жыхарамі савецкага радыё («рассадніка сепаратысцкага нацыяналізму і камунізму») быў уведзены строгі ўлік і кантроль усіх уладальнікаў радыёпрыёмнікаў. Выкарыстанне радыёпрыёмнікаў дазвалялася толькі ў клубах (святліцах), народных дамах. Польскія ўлады разумелі, што толькі рэпрэсіўнымі мерамі нельга нейтралізаваць савецкую прапаганду[53]. Кіраўніцтва IX Корпуса аховы памежжа ў канцы 1936 г. для процідзеяння «шкодніцкай дзейнасці» радыёстанцыі ў Мінску прапаноўвала пабудаваць альтэрнатыўную радыёстанцыю, «насыціць тэрыторыю вялікай колькасцю танных радыёпрыёмнікаў, якія будуць прымаць перадачы толькі варшаўскай ці мясцовай станцыі»[54]. У канцы красавіка 1938 г. пачала працу

---

[51] Политбюро ЦК РКП(б)-ВКП(б) и Коминтерн: 1919–1943 гг. Документы. М., 2004. С. 760.

[52] Станкевіч А. Каляндарныя нататкі // Куфэрак Віленшчыны. 2005. № 1. С. 184.

[53] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 1. Воп. 8. Спр. 1656. Арк. 21.

[54] ДАБВ. Ф. 1. Воп. 10. Спр. 832. Арк. 5.

радыёстанцыя ў Баранавічах (у дадатак да радыёстанцый у Варшаве і Вільні). Для правядзення эфектыўнай контрпрапаганды польская ваенная адміністрацыя прапаноўвала паскорыць радыёфікацыю заходнебеларускіх зямель. Аднак у асяроддзі пераважна незаможнага заходнебеларускага сялянства не было адмоўнага стаўлення да СССР, а звесткі пра сталінскія рэпрэсіі, калектывізацыю разглядаліся як антысавецкая прапаганда польскіх улад[55].

У цэлым, савецкі ўплыў ператварыўся ў важны знешні фактар (асабліва ў сярэдзіне – другой палове 1920-х гг.) у грамадскім жыцці жыхароў заходнебеларускіх зямель, хоць і не мог кардынальным чынам яго змяніць. Польскія ўлады мелі спрошчанае і стэрэатыпнае ўяўленне пра заходнебеларускі рух як пракамуністычны (прасавецкі), несамастойны, інспіраваны з усходу. Дынамічныя працэсы нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг., мэтанакіраваная матэрыяльная дапамога і маральная падтрымка, нягледзячы на іх ідэалагічную (камуністычную) абмежаванасць, аказвалі пазітыўны ўплыў на заходнебеларускі рух, асабліва яго радыкальнае крыло. З канца 1920-х гг. папярэдняга маштабнага ўздзеяння ўжо не назіралася, што было звязана з сур'ёзнымі зменамі ў грамадска-палітычным жыцці СССР. Нягледзячы на практычна поўнае згортванне дапамогі на ўзроўні арганізацый і негатыўныя наступствы сталінскіх рэпрэсій для заходнебеларускага руху, значная частка жыхароў Заходняй Беларусі на ўзроўні штодзённай свядомасці ўсё-такі працягвала са спадзяваннем глядзець на ўсход. Гэтаму спрыялі нявырашанасць польскімі ўладамі сацыяльных і нацыянальна-культурных праблем, складаная геапалітычная сітуацыя, сацыяльна-псіхалагічныя, этнічныя, гісторыка-культурныя, канфесійныя і іншыя фактары, а таксама ўздзеянне савецкай прапаганды.

***Аляксандр Вабішчэвіч***, *доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (г. Брэст).*

[55] У новай Айчыне: штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд. Беласток, 2001. С. 17.